**ГУК «Сеть публичных библиотек Мстиславского района»**

**Ходосовская сельская библиотека**

# ВІРТУАЛЬНАЯ КНІЖНАЯ ВЫСТАВА ПА КНІЗЕ А. А. МЯЦЕЛЬСКАГА

# «МСЦІСЛАЎСКАЕ КНЯСТВА І ВАЯВОДСТВА Ў XII – XVIII СТСТ.»

# Звесткі аб аўтары



Старший научный сотрудник
отдела источниковедения и археографии,
доктор исторических наук
Родился 16 сентября 1960 г. в г. Котбус, Германия. В 1984 г. окончил исторический факультет Гродненского государственного университета имени Я. Купалы. В 1990 г. окончил аспирантуру Института истории АН БССР. Кандидатская диссертация защищена в 1992 г. – “Города белорусского Посожья X–XIII вв.” (научный руководитель – д.и.н. П.Ф. Лысенко) по специальности 07.00.06 – археология.

В Институте истории НАН Беларуси работает с 1990 г.: 1990–1993 гг. младший научный сотрудник, 1993–1998 гг. научный сотрудник, 1998–2009 гг. старший научный сотрудник отдела археологии средневекового периода, 2009–2013 гг. старший научный сотрудник отдела истории Беларуси Средних веков и начала Нового времени, с 2014 г. старший научный сотрудник отдела источниковедения и археографии.

Институт туризма Белорусского государственного университета физкультуры.
**Сфера научных интересов:**
•археология и история Средневековья и Нового времени;
•историческая география;
•археография.
**Публикации**
Автор более 200 публикаций




Данная книга (монография) посвящена истории Мстиславского княжества и воеводства в XII – XVIII вв. В данном научном исследовании рассматривается социально-экономическое развитие региона, историческая география, урбанистические процессы, конфессиональная жизнь.

Книга рассчитана на научных сотрудников, преподавателей, студентов, всех, кто интересуется историческим прошлым Беларуси.

Книга состоит из введения, 7 глав, заключения, библиографического списка, многочисленных приложений, списка сокращений, включает 664 страницы, в том числе с иллюстрациями. Издана в Минске, в издательстве Академии наук Республики Беларусь в 2010 г.


НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

А. А. Мяцельскі

МСЦІСЛАЎСКАЕ
княства
і ваяводства
ў XII–XVIII стст.

2-е выданне, выпраўленае

Мінск

В 2014 г. книга получила второе дополненное и исправленное издание Книга издана в рамках Государственной комплексной программы научных исследований в 2006-2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры»

# ЗМЕСТ


**Уводзіны** ........ 3

*Глава 1.* **Фізіка-геаграфічны нарыс. Шляхі зносін** ........ 15

*Глава 2.* **Землі Сярэдняга і Верхняга Пасожжа ў IX–XIII стст.** ........ 40

2.1. Этнічная сітуацыя ў Сярэднім і Верхнім Пасожжы ў IX–XIII стст. ........ 40

2.2. Сістэма сельскага рассялення на Сярэднім Пасожжы ў X–XIII стст. ........ 45

2.3. Сярэдняе і Верхняе Пасожжа ў XI–XIII стст: пачатак фарміравання адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Узнікненне гарадоў ........ 62

*Глава 3.* **Мсціслаўскае княства другой паловы XII – пачатку XVI ст.** ........ 116

3.1. Узнікненне Мсціслаўскага княства і яго гісторыя ў другой палове XII – першай палове XIV ст. ........ 116

3.2. Мсціслаўскае княства Лынгвеневічаў канца XIV–XV ст. ........ 124

3.3. Мсціслаўскае княства першай чвэрці XVI ст. ........ 153

3.4. Землі былога Мсціслаўскага княства ў сярэдзіне XVI ст. ........ 166

3.5. Князі Мсціслаўскія на службе маскоўскай ........ 176

*Глава 4.* **Мсціслаўскае ваяводства ў другой палове XVI–XVIII ст.** ........ 195

4.1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны і гаспадарчы падзел Мсціслаўскага ваяводства ........ 195

4.1.1. Мсціслаўскае ваяводства на картах другой паловы XVI–XVIII ст. ........ 195

4.1.2. Тэрыторыя Мсціслаўскага ваяводства другой паловы XVI–XVIII ст. паводле пісьмовых крыніц ........ 200

4.1.3. Дзяржаўныя ўладанні на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ........ 207

4.2. Гісторыя Мсціслаўскага ваяводства ў XVI–XVIII стст. ........ 226

*Глава 5.* **Дынаміка асваення сельскіх абшараў Мсціслаўскага княства і ваяводства ў XIV–XVIII стст.** ........ 254

5.1. Тыпы сельскіх паселішчаў ........ 254

5.2. Дынаміка асваення сельскіх абшараў ў XIV–XVIII стст. ........ 260

5.3. Памеры і планіроўка паселішчаў ........ 282

*Глава 6.* **Урбанізацыйныя працэсы ў Мсціслаўскім княстве і ваяводстве ў XIV–XVIII стст.** ........ 287

...Гарады Мсціслаўскага княства і ваяводства ў другой палове XIV–XVIII ст. ........ 292

...кі Мсціслаўскага ваяводства XVI–XVIII стст. ........ 335

...ўласніцкія мястэчкі ........ 335

...ўскага староства ........ 357

*Глава 7.* **Канфесійнае жыццё ў Мсціслаўскім княстве і ваяводстве ў XII–XVIII ст.**

7.1. Пачатак распаўсюджвання хрысціянства на землях Сярэдняга і Верхняга Пасожжа ў XI–XIV стст. ........ 3

7.2. Развіццё праваслаўнай царквы на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства ў XIV–XVI стст. ........ 38

7.3. Распаўсюджванне царкоўнай уніі і ўзаемаадносіны уніяцтва з праваслаўем ў канцы XVI–XVIII ст. ........ 40

7.4. Пранікненне і распаўсюджванне каталіцкага касцёла ........ 439

7.5. Іудаізм ........ 467

**Заключэнне** ........ 474

**Бібліяграфія** ........ 477

**Дадаткі** ........ 547

**Спіс скарачэнняў** ........ 661



Навуковае выданне

**Мяцельскі** Андрэй Анатольевіч

**МСЦІСЛАЎСКАЕ КНЯСТВА І ВАЯВОДСТВА Ў XII–XVIII стст.**

2-е выданне, выпраўленае

Рэдактар *В. М. Пручкоўская*
Мастацкі рэдактар *Т. Д. Царова*
Тэхнічны рэдактар *М. В. Савіцкая*
Камп'ютарная вёрстка *Л. І. Кудзерка*

Падпісана да друку 15.01.2014. Фармат 70×100[1]/16. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 54,0. Ул.-выд. арк. 54,9. Тыраж 200 экз. Заказ 5.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука». П...
аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друк...
№ 1/18 ад 02.08.2013. Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, ...

# Краткий обзор содержания.



*Бацькам прысвячаецца*

УВОДЗІНЫ

У канцы XIX ст. у Кіеўскім універсітэце былі распачаты рэгіянальныя даследаванні па гісторыі Старажытнай Русі, у выніку якіх з'явіўся шэраг гістарычных прац па старажытным перыядзе Разанскага, Цвярскога, Чарнігаўскага, Полацкага, Смаленскага і іншых княстваў[1]. Абапіраючыся выключна на пісьмовыя крыніцы, тагачасныя даследчыкі не карысталіся звесткамі і матэрыяламі археалагічных даследаванняў, якія ў той час атрымалі даволі шырокае распаўсюджанне ў Расіі. Гэта ў пэўным сэнсе прывяло да аднабаковасці даследаванняў, якія выкладалі толькі палітычную гісторыю асобных тэрыторый.

Назапашванне новага матэрыяла, у першую чаргу археалагічнага, прывяло ў другой палове XX ст. да неабходнасці паўтарэння гэтага круга даследаванняў. У выніку з'явілася серыя новых прац[2], у якіх, у адрозненне ад па-

[1] Андрияшев А. М. Очерк истории Волынской земли до конца XIV столетия. – Киев: Тип. ун-та Св. Владимира, 1887. – 232 с.; Голубовский П. В. История Северской земли до половины XIV в. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1881. – 201 с.; Яго ж. История Смоленской земли до начала XV в. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1895. – 335 с.; Данилевич В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1896. – 264 с.; Багалей Д. И. История Северской земли до половины XIV столетия. – Киев: Унив. тип., 1882. – 310 с.; Грушевский А. С. Очерк истории Турово-Пинского княжества XI–XIII вв. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1901. – 78 с.; Грушевский, М. С. Очерк истории Киевской земли от смерти Ярослава до конца XIV столетия. – Киев: тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1891. – 520 с.; Довнар-Запольский М. В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1891. – 170 с.; Иванов П. А. Исторические судьбы Волынской земли с древнейших времен до конца XIV в. – Одесса: Универ. тип., 1895. – 435 с.; Иловайский Д. И. История Рязанского княжества. – М.: Универ. тип., 1859. – 329 с.; Ляскоронский В. Г. История Переяславской земли с древнейших времен до половины XIII столетия. – 2-е изд. – Киев: Тип. ун-та Св. Владимира, 1903. – 422 с.

[2] Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1950. – 331 с.; Монгайт А. Л. Рязанская земля. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1961. – 400 с.; Алексеев Л. В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. Очерки истории Северной Белоруссии. – М.: Наука, 1966 – 295 с.; Яго ж. Смоленская земля в IX–XIII вв. Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. – М.: Наука, 1980. – 264 с.; Никольская Т. В. Земля вятичей. К истории населения бассейна верхней и средней Оки в IX–XIII вв. – М.: Наука, 1981. – 295 с.; Юшко А. А. Московская земля IX–XV вв. – М.: Наука, 1991. – 192 с.; Лысенко П. Ф. Туровская земля IX–XIII вв. – Минск: Беларус. навука, 1999. – 268 с.; Зайцев А. К. Черниговское княжество X–XIII в.: избр. труды. – М.: Квадрига, 2009. – 226 с. + карты.

Во введении автор обосновывает актуальность и значимость работы, объект и предмет научного исследования.

Следует заметить, что на сегодняшний день книга А. А. Метельского –

единственная обобщающая научно-исследовательская работа об истории Мстиславского княжества, собственно Мстиславщины в период с XII по XVIII вв.

Кроме того, в данном исследовании подняты вопросы региональной «микро истории», отдельных сёл и владений ( например агрогородка Ходосы).



## Гістарыяграфія

Гісторыя вывучэння Мсціслаўскага княства і ваяводства на сённяшні дзень яшчэ не дастаткова распрацавана, хаця гісторыкаў гэтыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі пачалі цікавіць даўно.

Ужо пачынаючы з XIX ст. гісторыкаў у першую чаргу цікавіла генеалогія роду мсціслаўскіх князёў, і таму першыя працы, якія закранаі гісторыю Мсціслаўскага княства, былі прысвечаны гэтай праблематыцы і з'явіліся ўжо ў сярэдзіне XIX ст., калі ў Магілёўскіх губернскіх ведамасцях некалькі разоў друкаваліся артыкулы С. Сакалова. Праз некаторы час гэтыя ж артыкулы былі апублікаваны ў аб'яднаным выглядзе ў Памятнай кніжцы Магілёўскай губерні за 1868 год[4].

Некаторыя звесткі па генеалогіі мсціслаўскіх князёў сустракаюцца ў манаграфіі А. Б. Лабанава-Растоўскага, прысвечанай радасловію рускіх дваранскіх родаў[5]. Змястоўны нарыс, прысвечаны мсціслаўскім князям, што былі на вялікакняскай службе як у Вялікім Княстве Літоўскім, так і ў Рускім царстве, ёсць у выдадзенай ў сярэдзіне 90-х гадоў XIX ст. манаграфіі Е. Вольфа[6].

Пытанні генеалогіі мсціслаўскіх князеў напрыканцы XIX – у пачатку XX ст. разглядалі А. П. Барсукоў і Н. Мятлеў[7]. У сярэдзіне XX ст. свет убачыла публікацыя П. М. Раеўскага, прысвечаная роду князёў мсціслаўскіх, але яна значна саступае па інфармацыйнасці ўсім папярэднім і фактычна з'яўляецца кароткім храналагічным пераказам жыццядзейнасці мсціслаўскіх князёў[8].

Акрамя генеалогіі роду мсціслаўскіх князёў даволі рана пачаў прыцягваць да сабе ўвагу цэнтр княства і ваяводства – Мсціслаў. Яго старажытнасці пачалі выклікаць цікавасць яшчэ напрыканцы XVIII ст. Першыя звесткі пра старажытнасці Мсціслава – згадку пра існаванне ў ім замка – мы сустракаем ў апісаннях падарожжа імператрыцы Кацярыны II у Беларусь і на поўдзень[9]. У пачатку XVIII ст. У. Севергін, абапіраючыся на звесткі В. М. Тацішчава, звязаў час узнікнення Мсціслава з першым вядомым мсціслаўскім князем Мсціславам Раманавічам[10].

---

[4] Соколов С. Род князей Мстиславских // Могилевские губернские ведомости. – 1857. – № 1–3; 1869. – № 34–38.

[5] Русская родословная книга. – СПб.: Изд-во Русской старины, 1873. – 373 с.

[6] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – Warszawa: Gebethner, Wolff, 1895. – № 2. – S. 263–273.

[7] Барсуков А. П. Сведения об Юхотской волости и ее прежних владельцах князьях Юхотских и Мстиславских. С приложением статьи об Юхотских сокольих повытчиках. – СПб., 1894. – 78 с.; Мятлев Н. К родословию князей Мстиславских. – М., 1915. – 17 с.; Яго ж. К родословию князей Мстиславских // Сб. статей, посвященных Л. М. Савелову. – М., 1915. – С. 300–317.

[8] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских и угасший род князей Мстиславских и Ижеславских. – Париж, 1957. – 33 с.

[9] Топографические примечания на знатнейшие места путешествия ее императорского величества в Белорусские наместничества; сост. И. И. Лепехин [и др.]. – СПб.: Имп. Акад. наук, 1780. – С. 99; Путешествие Ее императорского величества в полуденный край России предприемлимое в 1786 году. – СПб.: Печ. при Горном училище, 1787. – С. 18.

[10] Севергин В. М. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российского государства. – СПб.: Изд-во Имп. Акад. наук, 1805. – С. 56.

Введение также включает историографический обзор, в котором А. А. Метельским дан обстоятельный системный анализ статей и монографий учёных работавших по данной теме в предыдущие годы – начиная с XIX столетия.

## ФІЗІЧНА-ГЕАГРАФІЧНЫ НАРЫС РЭГІЁНА. ШЛЯХІ ЗНОСІН

Фізічна-геаграфічная характарыстыка рэгіёна даследавання з'яўляецца неабходнай умовай для разумення асаблівасцей размяшчэння грамадства на мясцовасці. Залежнасць насельніцтва ад навакольнага асяроддзя выражалася ў адметнасцях гаспадаркі: выбар гаспадарчых стратэгій вызначаўся як узроўнем развіцця вытворчых сіл, так і наяўнасцю пэўных прыродных рэсурсаў. Месца жыхарства павінна было знаходзіцца ва ўмовах, якія забяспечвалі максімальную эксплуатацыю прыродных рэсурсаў з найменшай затратай сіл. На выбар месца для паселішча аказвала ўплыў і традыцыя: сяліліся там, дзе раней ужо жылі людзі, хаця зменлівыя ўмовы (сацыяльныя, экалагічныя) вымушалі некалькі мадэрнізаваць гаспадарку. Узнікненне і рост паселішчаў вызначаліся мноствам фактараў, якія былі звязаны паміж сабой лабірынтам дробнамаштабных прычынных сувязяў[1].

Найбольш уплывовымі фактарамі былі клімат, рэльеф, глебаўтваральныя пароды (якасць глебы), біялагічныя фактары (раслінны, жывёльны свет), гідралагічная сетка.

Мсціслаўскае княства, а потым ваяводства ў розныя часы свайго існавання ўваходзіла ў склад іншых, больш буйных дзяржаўных аб'яднанняў. У сярэдзіне XII – сярэдзіне XIV ст. Мсціслаўскае ўдзельнае княства ўваходзіла ў склад Смаленскай зямлі, знаходзілася на яе паўднёвым захадзе і межавала з Чарнігаўскім, а потым Бранскім княствам на поўдні. На поўначы, захадзе і ўсходзе да яго земель прылягалі ўнутраныя раёны Смаленскай зямлі.

Тэрыторыя Мсціслаўскага княства не мела выразна акрэсленых геаграфічных межаў. З захаду ў XII – сярэдзіне XIV ст. яго межы ішлі прыкладна па плыні р. Проня, з усходу і поўдня – уздоўж плыні р. Іпуць. На поўначы мяжой Мсціслаўскага княства з'яўлялася рэчышча р. Рамяство і яе правых прытокаў, адкуль яна ішла ў напрамку р. Гародня, па апошняй мяжа ішла ў р. Віхра, падымалася па ёй прыкладна да сучаснага г. Манастыршчына і далей паварочвала на ўсход у бок р. Сож, а потым на р. Іпуць. Агульная плошча Мсціслаўскага княства да пачатку XVI ст. складала не меней за 20 000 кв. км.

З сярэдзіны XIV ст. Мсціслаў увайшоў у склад Вялікага Княства Літоўскага, у якім і заставаўся да 1772 г. У пачатку XVI ст. ўсходнія і паўднёвыя землі Мсціслаўскага княства, а з сярэдзіны XVI ст. – ваяводства апынуліся на

[1] Хаггет П. Пространственный анализ в экономической географии: пер. с англ. – М.: Прогресс, 1968. – С. 42.

В главе первой, которая посвящена физико-географическому очерку региона, а также путям сообщения проанализированы сведения о топонимах и гидронимах Мстиславщины в средневековое время. Дан анализ гидрографической сетки Мстиславского княжества как средства коммуникации, мест возникновения средневековых поселений и их ландшафтной приуроченности Проанализированы такие пути сообщений как волоки, тракты, броды и мосты.

## ЗЕМЛІ СЯРЭДНЯГА І ВЕРХНЯГА ПАСОЖЖА Ў IX–XIII стст.

### 2.1. Этнічная сітуацыя ў Сярэднім і Верхнім Пасожжы ў IX–XIII стст.

Сярэдняе і Верхняе Пасожжа ў VII–VIII стст. было заселена носьбітамі калочынскай культуры і культуры тыпу верхняга слоя гарадзішча Тушамля, мяжа паміж якімі праходзіла прыкладна па лініі Быхаў – Слаўгарад – міжрэчча Сожа і Беседзі – Іпуць. У VIII–X стст. тут адбываецца змена насельніцтва: з поўначы сюды пранікала насельніцтва культуры тыпу смаленскіх доўгіх курганоў, а з поўдня Пасожжа пачынала асвойваць роменскае насельніцтва.

На сённяшні дзень помнікаў VIII–IX стст. у Верхнім Пасожжы, якое асвойвалі носьбіты культуры смаленскіх доўгіх курганоў, выяўлена мала. Паселішчы гэтага часу вядомы толькі ў раёнах, што прымыкаюць да Дняпра, – каля вёсак Буянава, Раманаўка, Смілава Краснянскага раёна Смаленскай вобласці. У Пачынкаўскім раёне, на Дняпры, селішчы і курганы гэтага часу вядомы каля вёсак Арэфіна, Беларучча, Агаркава. У бліжэйшым наваколлі Смаленска помнікі культуры смаленскіх доўгіх курганоў вядомы каля вёсак Бярэзінка (селішча і курганы), Барышчаўшчына (селішча), Міціна (курганы), Кушляншчына (селішча і курганы)[1].

Блізкасць да Дняпра вытокаў Сожа спрыяла таму, што ўздоўж плыні апошняга носьбіты культуры смаленскіх доўгіх курганоў актыўна пранікалі і ў больш паўднёвыя раёны. Селішчы гэтага тыпу на Сожы выяўлены каля вёсак Вярхнедава, Фралова. У гэтым жа раёне выяўлены і курганныя могільнікі гэтай культуры. Яны вядомы каля вёсак Цуркоўка, Васільева, Слабада-Глушыца, Елаўцы[2]. Прычым, згодна з новым аналізам інвентара з гэтых пахаванняў, каля Дняпра могільнікі з доўгімі курганамі ўзнікаюць у другой палове VIII ст., а на Пасожжа культура смаленскіх доўгіх курганоў пранікае некалькі пазней – у канцы VIII – першай палове IX ст.[3]

Самыя паўднёвыя помнікі культуры смаленскіх доўгіх курганоў (селішчы, курганы) на Пасожжы сустракаюцца ў раёне вёсак Фралова, Слабада-Глушыца, Елаўцы. У некаторым аддаленні ад іх знаходзіцца курганны могільнік

---

[1] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 1. – С. 72, 74, 113, 114, 118, 210, 217, 218; Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 2. – С. 68, 72, 89.

[2] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 2. – С. 73, 99–100, 176–177, 181.

[3] Нефедов В. С. О времени возникновения культуры смоленско-полоцких длинных курганов // Археология и история Пскова и Псковской земли. Материалы науч. семинара 1996–1999 гг. – Псков, 2000. – С. 195–197; Яго ж. Салтовские древности в смоленских длинных курганах // ГАЗ. – Мінск, 2002. – № 17. – С. 137.




Мал. 1. Археалагічныя помнікі VIII–X стст.: *1* – Агаркава-1, 2; *2* – Агаркава-3; *3* – Антонаўка; *4* – Арэф'іна-1; *5* – Арэф'іна-2, 3; *6* – Асавік; *7* – Атраднае; *8* – Баршчэўшчына-1; *9* – Беларучча; *10* – Белкіна; *11* – Блінныя Кучы; *12* – Болатава; *13* – Борча; *14* – Буянава; *15* – Бярэзінка; *16* – Вішнякі; *17* – Варабейна; *18* – Варотніна; *19* – Вежкі; *20* – Вербаўка; *21* – Волжына-2; *22* – Выганічы; *23* – Вярхідава; *24* – Галубея; *25* – Ганіна; *26* – Ганіна; *27* – Ганіна-2; *28* – Гарадцы-1; *29* – Гарадцы-2; *30* – Гомель; *31* – Горыцы; *32* – Грышына Слабада; *33* – Дмітрава-2; *34* – Дубавец; *35* – Дубна; *36* – Дубосішча; *37* – Елаўцы; *38* – Загор'е-1; *39* – Загор'е-2; *40* – Зарэчнае; *41* – Знаніе; *42* – Іванікі; *43* – Кісловічы; *44* – Казарычы; *45* – Кветунь; *46* – Крастовая-1; *47* – Крастовая-2; *48* – Крычаў; *49* – Кушляншчына 2, 3; *50* – Кушляншчына-4; *51* – Лопазна-1; *52* – Лопазна-2; *53* – Лугавец; *54* – Макарава-4; *55* – Мглін; *56* – Мураўшчына; *57* – Ніжняе-5; *58* – Новый Дрокаў; *59* – Палужжа; *60* – Пасудзічы-5; *61* – Пасудзічы-6; *62* – Перагон; *63* – Пракопаўка-1; *64* – Рабчычы; *65* – Радуціна; *66* – Раманаўка; *67* – Рэкавічы; *68* – Рэкавічы-2; *69* – Рогава-3; *70* – Селішча; *71* – Слаўгарад; *72* – Слабада Глушыца; *73* – Случоўск-1; *74* – Случоўск-2; *75* – Случоўск-3; *76* – Смілава; *77* – Смяльч; *78* – Сож; *79* – Сопычы-1; *80* – Сопычы-2; *81* – Старадуб; *82* – Суворава; *83* – Сушкоўшчызна; *84* – Тварышчы; *85* – Трубчоўск; *86* – Уладзіміраўка; *87* – Уладзіміраўка-2; *88* – Усох; *89* – Фралова; *90* – Хатылёва-1; *91* – Хатылёва-5; *92* – Чавусы-1; *93* – Чавусы-2, 3, 4, 5; *94* – Чартанёва; *95* – Чачэрск; *96* – Шчарба...; *97* – Юдзінава-9; *98* – Якаўлевічы-4



Глава вторая посвящена истории населения верхнего и среднего течения р. Сож и его притоков в период с IX по XIII вв. (Высокое средневековье). Автор проанализировал этническую ситуацию в Верхнем и Среднем Посожье, систему сельского расселения в данном регионе, а также вопросы возникновения городских центров в верхнем и среднем течении р. Сож. Особо стоит отметить, что в данной главе автор прибегал к анализу археологических источников, а также данным летописей. На широком источниковом материале автор показал, что уже в XI-XII вв. в Верхнем и Среднем течении р. Сож формируется устойчивая система административно-территориального раздела территории которая входила в состав Смоленской земли.



■ – гарадзішча; ▲ – курган; + – гарадзішча і курган; ◆ – селішча; ● – гарадзіш
і селішча

Археологические памятники X-XIII вв.

## МСЦІСЛАЎСКАЕ КНЯСТВА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XII – ПАЧАТКУ XVI ст.

### 3.1. Узнікненне Мсціслаўскага княства і яго гісторыя ў другой палове XII – першай палове XIV ст.

Як ўжо адзначалася, гісторыя Мсціслаўскага княства вельмі цяжка паддаецца рэканструкцыі, што выклікана перш за ўсё малой захаванасцю крыніцазнаўчай базы. Якое б пытанне з гісторыі княства мы ні ўзнімалі, крыніцы дазваляюць нам зрабіць толькі агульны схематычны нарыс, а для дэтальнай прапрацоўкі малюнка не хапае дакументаў. Тым не менш, паспрабуем разглядзець гісторыю Мсціслаўскага княства пачынаючы з высвятлення пытання пра час яго ўзнікнення і вызначэння першапачатковай тэрыторыі.

Летапісныя паведамленні пра заснаванне ці дакладнае існаванне ўдзельнага стала ў Мсціславе ў XII–XIII стст. да нас не дайшлі. Найбольш раннюю дату пра заснаванне ўдзельнага Мсціслаўскага княства мы сустракаем у П. М. Раеўскага. Згодна з яго паведамленнем, Мсціслаўскае княства было заснавана ў 1151 г. Расціславам Мсціславічам[1]. Аднак ніякіх спасылак на першакрыніцу, з якой ідзе гэта дата, на вялікі жаль, аўтар не дае.

Другое паведамленне пра існаванне Мсціслаўскага ўдзела ў Смаленскай зямлі XII–XIII стст. захавалася ў В. М. Тацішчава. У «Гісторыі Расійскай», апавядаючы пра падзеі 1180 г., ён паведамляе, што паміраючы смаленскі князь Раман Расціславіч: «…оставил по себе сына Мстислава, которому построил город Мстиславль в области Смоленской и тамо велел ему под властию стрыя его быть»[2]. Але і ў дадзеным выпадку ў аўтара адсутнічаюць спасылкі на першакрыніцу.

Пакідаючы па-за ўвагай сцвярджэнне В. М. Тацішчава пра будаўніцтва ў 1180 г. горада Мсціслава, звернем увагу на другую частку гэтай крыніцы, у якой непасрэдна гаворыцца пра перадачу Раманам Расціславічам горада ў кіраванне свайму сыну Мсціславу, што паказвае значнасць горада сярод іншых гарадскіх цэнтраў Смаленскай зямлі.

Факт перадачы горада ў кіраванне прадстаўніку малодшай галіны смаленскіх Расціславічаў пры знаходжанні на цэнтральным, смаленскім стале прадстаўніка старэйшай галіны дазваляе сцвярджаць пра існаванне як мінімум з канца ў XII ст. падзелу адзінай Смаленскай зямлі на ўдзельныя сталы, адным з якіх быў мсціслаўскі.

[1] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 21.
[2] Татищев В. Н. История Российская: в 7 т. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1964. – Т. 3. – С. 123; Янин В. Л. Заметки о комплексе документов Смоленской епархии. – С. 118.



Глава третья посвящена истории Мстиславского княжества во второй Половине XII – первой половине XIV вв. Автором проанализированы причины возникновения Мстиславского княжества, а также вопросы истории княжества в указанный период.

**Владельцы Мстиславского княжества в XIV-XVI вв.**





*Глава 4*

МСЦІСЛАЎСКАЕ ВАЯВОДСТВА
Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI–XVIII СТ.

У 1564 г. у Вялікім Княстве Літоўскім была праведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа, у выніку якой ў краіне было арганізавана пяць новых ваяводстваў, у тым ліку і Мсціслаўскае. У 1565 г. рэформа была зацверджана пастановай Віленскага сейма. Новаўтворанае Мсціслаўскае ваяводства было створана на аснове валасцей Мсціслава і Крычава і складалася з аднаго павета. Але яшчэ даволі доўгі час традыцыйна крыніцы адзначалі існаванне ў мінулым самастойнай Крычаўскай воласці: час ад часу яны згадвалі размяшчэнне шляхецкіх уладанняў у «Крычаўскім тракце».

У «Спісанні граніц і паветаў», складзеным напярэдадні Віленскага сейма, межы новаўтворанага Мсціслаўскага ваяводства вызначаны так: «Почовши от границы Московской, шляхта вся зъ замкомъ Радомскимъ по границу Могилёвъскую, замокъ Кричовъский со всей шляхтою ажъ до границу Гомейскую». Новаўтворанае ваяводства артымала «харугв жолтую в чырвоном поле герб»[1].

**4.1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны і гаспадарчы падзел Мсціслаўскага ваяводства**

**4.1.1. Мсціслаўскае ваяводства на картах другой паловы XVI–XVIII ст.**

У вызначэнні межаў Мсціслаўскага ваяводства другой паловы XVI–XVIII ст. ёсць пэўная блытаніна, выкліканая перш за ўсё інфармацыяй, якую мы атрымліваем з картаграфічных крыніц. На ўсіх картах Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага, на якіх паказаны памеры ваяводстваў, у склад Мсціслаўскага ваяводства ўваходзіць значна большая тэрыторыя, чым гэта вынікае з пісьмовых крыніц.

Перш за ўсё гэта датычыцца Магілёўскага старостава, якое на ўсіх картах адносіцца да Мсціслаўскага ваяводства. Такая картаграфічная традыцыя праходзіць праз усе карты Еўропы, Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага другой паловы XVI–XVIII ст.

Горад Мсціслаў упершыню з'яўляецца на картах Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVI ст., але толькі з пачатку XVII ст. на картах пачынаюць адзначаць межы Мсціслаўскага ваяводства.

[1] РИБ. – Т. 30. – С. 895; Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. – С. 166, 231.

195

В главе четвертой рассматривается история Мстиславского воеводства в период с XVI – по XVIII вв.

Автор анализирует информацию о административно-территориальном и хозяйственном разделении Мстиславского княжества, с привлечением данных картографии и письменных источников. Показана история Мстиславского воеводства в контексте истории государства Речь Посполитая.



**Портрет Мстиславского старосты Януша Радзивилла (1643-1650 гг.)**




**Мстиславское воеводство на карте Великого княжества Литовского 1613 г.**


Глава 5

ДЫНАМІКА АСВАЕННЯ СЕЛЬСКІХ АБШАРАЎ МСЦІСЛАЎСКАГА КНЯСТВА І ВАЯВОДСТВА Ў XIV–XVIII стст.

5.1. Тыпы сельскіх паселішчаў

У XIV–XVIII стст. асноўным тыпам сельскіх паселішчаў на землях сучаснай Беларусі, у тым ліку і на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства, былі вёскі. Самай распаўсюджанай назвай сельскіх паселішчаў у XIV–XVIII стст. было «сяло». Тэрмін «сяло» ўвесь час сустракаецца як ў беларускамоўных, так і польскамоўных пісьмовых крыніцах, якія тычацца Пасожжа перыяду даследавання. Акрамя таго, у некаторых беларускамоўных крыніцах для вызначэння сельскага паселішча ў XV–XVI стст. ужываецца тэрмін «сялко». Тэрмін «вёска», «весь» пачынае выкарыстоўвацца ў польскамоўных крыніцах толькі з другой паловы XVII ст.

Сёлы XIV–XVIII стст. складаліся з асобных двароў – «дымоў». Двары ў сёлах аб'ядноўваліся ў «службы», якія з'яўляліся адзінкай падаткаабкладання сялян і звычайна складаліся з двух-трох дымоў[1].

У чым розніца паміж тэрмінамі «сяло» і «сялко», дакладна не зразумела. Аналіз колькасці «дымоў» ці «службаў» у тым ці іншым населеным пункце не дае адказу на гэтае пытанне. У катэгорыі «сяло» сустракаюцца населеныя пункты, у якіх налічваецца як 40, так і 4 службы. Тэрмін «сялко» адносіцца выключна да невялікіх населеных пунктаў, у якіх налічваецца ад 3 да 8 дымоў.

У той жа час назіранні за суадносінамі паміж населенымі пунктамі з тэрмінам «сяло» і «сялко» ў Расіі XVII–XVIII стст. паказваюць, што «сяло» звычайна выступае ў якасці цэнтра пэўнай акругі, а «сялко» – у якасці падначаленага населенага пункта, які ўваходзіць у акругу сяла. Акрамя таго, крыніцы адзначаюць абавязковую наяўнасць у расійскім сяле храма. Падобная ж карціна назіраецца і сярод населеных пунктаў ВКЛ. Сяло заўсёды выступае ў якасці альбо цэнтра маёнтка, да якога прылягаюць іншыя, альбо населенага пункта, у якім размешчаны храм.

Зрэдку для вызначэння сельскага населенага пункта выкарыстоўваецца тэрмін «прысёлак», які звычайна ўжываецца ў адносінах да паселішчаў, якія ўваходзяць у склад якой-небудзь «маетнасці». Так, прысёлкі Несцерава і Самава згадваюцца сярод населеных пунктаў, прылеглых да сяла Беразетня Мсціслаўскага староства[2]. Такім чынам, прасочваецца аднолькавасць тыпаў населеных пунктаў, якія называюцца «сялко» і «прысёлак».

[1] Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси. – С. 64–65.
[2] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 96. – Арк. 133 адв.–133.



В главе пятой А. А. Метельский рассматривает вопросы динамики освоения сельского пространства Мстиславского княжества и воеводства в XIV-XVI вв.
Автор систематизировал сведения о сельских поселениях, динамике расселения сельского населения, обобщил данные о размерах и планировке поселений населения Мстиславского княжества и воеводства.




● – вёска; ▣ – горад

Мал. 43. Населеныя пункты Мсціслаўскага княства XV ст.: *1* – Ажогі; *2* – Алексінскае; *3* – Ануфрыева; *4* – Арлоўка; *5* – Бабынкі; *6* – Баранаўка; *7* – Басценавічы; *8* – Бацвінаўка; *9* – Бачэнкі; *10* – Беразуйкі; *11* – Бяскоўка; *12* – Будагошч; *13* – Бязводзічы; *14* – Бялішчына; *15* – Валоўнікі; *16* – Вароніна; *17* – Воўчас; *18* – Галкавічы; *19* – Галоўчын (Сялец); *20* – Гарадок; *21* – Глупікі (Мірная); *22* – Данілаўка; *23* – Дарлівае; *24* – Добрае; *25* – Добрынскае; *26* – Дубасна; *27* – Дуброўка; *28* – Забычанне; *29* – Залесавічы; *30* – Заньковічы; *31* – Зуі; *32* – Зяціца; *33* – Іванаўка; *34* – Каўшова; *35* – Какотава; *36* – Калеснікі; *37* – Калодзезі; *38* – Камаровічы; *39* – Касмынічы; *40* – Князішчава; *41* – Колтава; *42* – Краснавічы; *43* – Краснае; *44* – Крутая; *45* – Халхла (Крутая); *46* – Крываносава; *47* – Крычаў; *48* – Кудрычы; *49* – Куроўшчына; *50* – Куровіцкая Слабада; *51* – Лопазна; *52* – Лыза; *53* – Людагошч; *54* – Міхайлаўскае; *55* – Мазалава; *56* – Мглін; *57* – Мсціслаў; *58* – Мышкавічы; *59* – Новае Сяло; *60* – Пірагова; *61* – Пажога; *62* – Парадзіна; *63* – Пацолтава; *64* – Папялёўка; *65* – Песькавічы; *66* – Пнеўшчына; *67* – Пузырова; *68* – Пустынкі; *69* – Пясчанка; *70* – Пясчынікі; *71* – Пяськевічы; *72* – Пятровічы; *73* – Пячковічы; *74* – Радамля; *75* – Рай; *76* – Рамяство; *77* – Расна; *78* – Рожава; *79* – Сапрынавічы; *102* – Свяцілавічы; *80* – Селішча; *81* – Слаўновічы; *103* – Слабада (Зарэчча); *82* – Сохань; *83* – Ст. Разанцы; *84* – Старае Сяло; *85* – Ст. Віхраны; *86* – Сутокі; *87* – Сялец; *88* – Тупічына; *89* – Тухля; *90* – Хіславічы; *91* – Хачымча; *92* – Хвастова; *93* – Ходасы; *94* – Ціманава; *95* – Цімошкі; *96* – Цімошкава; *97* – Цяцерынскае (Сялец); *98* – Чапляеўка; *99* – Рылаўшчына (Чырвоная Гара); *100* – Шамаўшчызна; *101* – Шумянічы




... – горад; ● – вёска; – – – – граніца Мсціслаўскага ваяводства; ........
...йная граніца

**Населённые пункты Мстиславского воеводства в XVII в.**

**Населенные пункты Мстиславского княжества в XV в.**

# УРБАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў МСЦІСЛАЎСКІМ КНЯСТВЕ І ВАЯВОДСТВЕ Ў XIV–XVIII СТСТ.

Урбанізацыйны працэс з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай наступу цывілізацыі. Гарады былі вынікам развіцця прадукцыйных сіл грамадства, а іх эканоміка, у сваю чаргу, аказвала ўплыў на фарміраванне і развіццё мясцовых, а з часам і міжнародных рынкаў. Адначасова гарады першымі выпрабоўвалі на сабе лёс гісторыі, і генезіс гарадоў, іх стан, жыццё, развіццё сапраўды можна параўнаць са своеасаблівай нервовай сістэмай, што адлюстроўвае грамадскае жыццё[1]. Урбанізацыйныя працэсы, што адбываліся на Сярэднім Пасожжы ў XIV–XVIII стст., сапраўды яскрава дэманструюць той складаны лёс, які прайшоў рэгіён за гэтыя пяць стагоддзяў.

Корпус пісьмовых крыніц XIV–XVII стст., якія адлюстроўваюць урбанізацыйныя працэсы, што адбываліся на Пасожжы, адносна нешматлікі, таму на першым этапе (XIV–XV стст.) у асвятленні гэтай праблематыкі вялікую ролю адыгрываюць даныя археалогіі і агульныя разважанні зыходзячы з тых працэсаў, якія мы прасочваем тут.

У рэгіёне даследавання ў XII–XIII стст. у параўнанні з раёнамі, што прылягаюць да буйных гарадскіх цэнтраў – Смаленска, Старадуба, Гомія, назіраецца адносна малая колькасць невялікіх умацаваных паселішчаў, якія былі сядзібамі буйных феадалаў. Гэта тэндэнцыя, верагодна, была выклікана тым, што большая частка Пасожскіх земель была пакінута смаленскімі князямі ў якасці свайго дамена, а на астатніх, прылеглых да дамена землях, вялікакняская сям'я таксама не садзейнічала фарміраванню буйной зямельнай уласнасці.

На гэтых землях на працягу XII–XIII стст. гарадскімі цэнтрамі з'яўляліся, як адзначалася вышэй, Мсціслаў, Рослаўль, Пацынь, Мглін, Заруб-Навасёлкі, Крэчут, Прупой, Красн, Васільеў-Горы, Дрокаў, Басея, магчыма Радамля і дакладна не лакалізаваны Зарой.

Структура гарадскіх цэнтраў, якая склалася на Сярэднім Пасожжы ў XII–XIII стст., уключала ў свой склад як буйныя гарады – цэнтры рамяства і гандлю (Мсціслаў, Рослаўль, Пацынь, Мглін), так і буйныя княскія замкі – Красн, Васільеў, Заруб, і невялікія адміністрацыйна-гаспадарчыя цэнтры асобных валасцей, што толькі станавіліся на шлях гарадскога развіцця – Басея, Крэчут, Прупой, Дрокаў.

[1] Gieysztor A. Glos w diskusji na sympozium sieci miejskiej w 1979 r. // KHKM. – 1980. – № 3. – S. 429.



**В главе шестой рассматриваются вопросы процессов урбанизации (роста городов и населения) в Мстиславском княжестве и воеводстве в XIV-XVIII вв.**
**Автором рассмотрена история городов, местечек, государственных и частновладельческих населённых пунктов.**
**Автор делает вывод о том, что вследствие урбанизационных процессов которые происходили на территории Мстиславского княжества и воеводства, в Мстиславском воеводстве, в соответствии с данными русских источников, в 1773 г. был один город Мстиславль, 22 частновладельческих и государственных местечка.**




**План Мстиславля конца XVIII в.**




Топография Мстиславля в XV-XVI вв.



**Реконструкция церкви-донжона и часовни, по раскопкам Л. В. Алексеева в Мстиславле**



*Глава 7*

**КАНФЕСІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў МСЦІСЛАЎСКІМ КНЯСТВЕ І ВАЯВОДСТВЕ Ў XII–XVIII СТСТ.**

**7.1. Пачатак распаўсюджвання хрысціянства на землях Сярэдняга і Верхняга Пасожжа ў XI–XIV стст.**

Сярэднявечча нельга ўявіць сабе без рэлігійнага жыцця, якое з'яўлялася арганічнай часткай паўсядзённай дзейнасці чалавека. Цэрквы, касцёлы, сінагогі былі своеасаблівай візітнай карткай гэтай эпохі, якая застаецца амаль недаследаванай галіной культурнай спадчыны. Рэлігія ў Сярэднявеччы праскала ўсе сферы жыцця чалавека і апасродкавана мела вялікі ўплыў на ўзаемадачыненні і жыццё людзей.

Прыняцце ў 988 г. кіеўскім князем Уладзімірам хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі Кіеўскай Русі паклала пачатак яго шырокаму распаўсюджванню па абшарах Усходняй Еўропы. Аднак прыняцце хрысціянства не было аднаактавай падзеяй, яно расцягнулася на некалькі стагоддзяў. Змена ідэалогіі, якая закранала асноўныя моманты духоўнага жыцця, быта і гаспадарчай дзейнасці, магла працякаць вельмі павольна, на працягу жыцця некалькіх пакаленняў.

У 988 г. фактычна адбыўся афіцыйны хрост толькі жыхароў сталіцы дзяржавы – Кіева. А пасланы ў наступным годзе у Ноўгарад для хрысціянізацыі ваявода Дабрыня сустрэў супраціў мясцовага насельніцтва. Падобная карціна, верагодна, адбывалася і на іншых землях усходніх славян.

Фактычна адразу пасля хрышчэння жыхароў Кіева пачалася адміністрацыйна-тэрытарыяльная арганізацыя новаахрышчанай тэрыторыі: была арганізавана Кіеўская мітраполія, шасцідзясятая па чарзе мітраполія Канстанцінопальскага патрыярхату. Разам са стварэнем Кіеўскай мітраполіі былі ўстаноўлены вікарныя епархіі: у Чарнігаве, Белгарадзе, Ноўгарадзе, Пераяслаўлі, Юр'еве, Полацку. Прыблізна пачаткам XI ст. (1013 г.) датуецца хрост Смаленскай зямлі[1]. Але трэба прызнаць, што дзейнасць гэтых епархій на першапачатковым этапе фактычна абмяжоўвалася тэрыторыямі буйных адміністрацыйных і культавых цэнтраў – Чарнігава, Старадуба, Гомія, Смаленска. Асноўная маса сельскага насельніцтва яшчэ доўгі час заставалася верней паганству, і ў сельскае асяроддзе хрысціянства, безумоўна, пранікала са значным спазненнем.

Паступовае пранікненне хрысціянства і змена ідэалагічных поглядаў добра прасочваюцца па змене пахавальнага абраду на працягу X–XIII стст. Гэта адбылося таму, што царква ўспрыняла ветхазапаветную іудзейскую традыцыю пахавання нябожчыкаў у зямлі, ці ў «грабах» – пячарах. Звычай паха-

[1] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 239.



В седьмой главе автор рассматривает вопросы конфессиональной жизни на территории Мстиславского княжества и воеводства. Затрагиваются вопросы распространения христианства на землях Среднего и Верхнего Посожья, развития православной церкви, распространения церковной унии (1596 г.), распространения католицизма, а также иудаизма






**Образ Пустынской Божьей матери**

Храмы XV-XVI вв.
 на территории Мстиславского
княжества и воеводства






Мал. 111. Сінагогі ў Мсціслаўскім ваяводстве ў XVIII ст.: *1* – Дрыбін; *2* – Забычанне; *3* – Ка
на; *4* – Касцюковічы; *5* – Крычаў; *6* – Лазовіца; *7* – Манастыршчына; *8* – Мілаславічы;
Мсціслаў; *10* – Пятровічы; *11* – Расна; *12* – Родня; *13* – Татарск; *14* – Хіславічы; *15* – Хоцім
*16* – Шамава; *17* – Шумячы

**Мстиславль. Костёл кармелитов.**

Синагоги в Мстиславском воеводстве в XVIII в.


## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Шаноўныя чытачы! Перад вамі прайшла гісторыя Мсціслаўскага княства і ваяводства на працягу больш як 500 гадоў існавання гэтых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Мы разглядзелі пытанні гісторыі іх утварэння, тэрытарыяльнага развіцця, адміністрацыйна-гаспадарчага падзелу, прасачылі дынаміку асваення тэрыторыі, урбанізацыйныя працэсы, канфесіянальнае жыццё на гэтых землях, вывучылі гандлёвыя шляхі, што праходзілі праз гэты рэгіён на розных этапах. Многія пытанні, што ставіліся перад пачаткам працы над гэтым даследаваннем, не ўдалося асвятліць з-за недахопу крыніц, аднак у цэлым мы змаглі прасачыць агульны кірунак развіцця і месца Мсціслаўскага княства і ваяводства ў складзе Смаленскага княства, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Мсціслаўскае княства як сталая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Смаленскай зямлі ўтварылася прыкладна ў адзін час, калі на тэрыторыі вялікага Смаленскага княства пачалася феадальная раздробленасць і сфарміраваліся ўдзельныя Мажайскае і Вяземскае княствы.

Яно было сфарміравана на падставе паўднёвых зямель крывічоў, што жылі ў міжрэччы Дняпра і Дзясны, і паўночных зямель радзімічаў, якія былі далучаны да Смаленскага княства ў выніку паходаў 1128 і 1142 гг. На захадзе землі Мсціслаўскага княства дасягалі плыні р. Проня, на ўсходзе – басейна Стомячы і Іпуці. Паўночная мяжа праходзіла па рэках Рамяство, Гародня, Лютая, а на поўдні заходзіла за р. Іпуць і фактычна выходзіла на старую мяжу паміж радзімічамі і севяранамі.

Мсціслаўскае ўдзельнае княства пачынаючы з сярэдзіны XII ст. і да сярэдзіны XIV ст. знаходзілася ў сталым дынастычным уладанні вялікіх смаленскіх князёў, пераходзячы ў якасці ўдзелу да чарговага князя, які займаў старшы стол у Смаленску.

У пісьмовых крыніцах палітычная гісторыя Мсціслаўскага ўдзельнага княства сярэдзіны XII–XIV ст. амаль не прасочваецца, што выклікана адсутнасцю смаленскіх летапісаў, а ў кола зроку летапісацаў агульнарускіх летапісных зводаў гэты рэгіён трапляў рэдка. Тым не менш, археалагічны матэрыял сведчыць пра даволі актыўны урбаністычны працэс на гэтых землях менавіта ў той час. Будуецца Мсціслаў, новая крэпасць у Крычаве, фарміруюцца гарадскія цэнтры ў Мгліне, Прапойску, Ст. Дрокаве, Радамлі.

В заключении автор подводит итоги фундаментальной работе посвящённой истории Мстиславского княжества и воеводства в период с XII по XVIII вв.

Автор отмечает, что данное исследование не завершает, а подводит некоторые выводы в изучении истории Мстиславля и его региона. Дальнейшая работа археологов и историков позволит более полно осветить историю Мстиславского княжества и воеводства